ДУА “Пагост-Загародская сярэдняя школа імя славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія” Пінскага раёна
Аўтар: Мелюх Таццяна Мікалаеўна, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі

*(урок матэматыкі рэкамендаваны для правядзення ў 1 класе)*

**Прадмет:** матэматыка
**Клас:** 1
**Урок № 58: Тэма ўрока:** Замацаванне

**Мэта і задачы:** замацоўваць веды аб утварэнні, абазначэнні і дзесятковым складзе лікаў ад 10 да 15; уменне выконваць складанне і адніманне лікаў у межах 15, заснаванае на ведах дзесятковага саставу лікаў; уменне вызначаць час па цыферблатным гадзінніку з дакладнасцю да гадзіны.

**Задачы асабістага развіцця:** садзейнічаць стварэнню зместавых і арганізацыйных умоў для развіцця уменняў аналізаваць.

**Абсталяванне:** набор геаметрычных фігур, прадметныя малюнкі, карткі з лічбамі і знакамі, макет цыферблата гадзін.

## Ход урока

### I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЭТАП.

Вось званок вясёлы змоўк,
Запрасіў усіх на ўрок.
Каб работа закіпела,
Усё, што патрэбна нам для справы,
Будзем хутка правяраць:
Ручка, падручнік, аловак і сшытак?
Усё! Мы можам пачынаць!

**Настаўнік.** Сёння ў нас незвычайны ўрок. Даведацца, чым будзем займацца, дапаможа шыфроўка.

| | ТАК | НЕ |
|---|---|---|
| **10 > 8** | **З** | **С** |
| **11 < 10** | **О** | **А** |

| | | |
|---|---|---|
| **12 = 13** | **Р** | **М** |
| **15 > 12** | **А** | **Ш** |
| **15 = 14** | **Е** | **Ц** |
| **9 < 10** | **А** | **Л** |
| **7 > 14** | **О** | **В** |
| **13 < 12** | **Я** | **А** |
| **12 < 14** | **Н** | **Б** |
| **10 = 11** | **М** | **Н** |
| **14 < 8** | **Т** | **Е** |

**Настаўнік**. Якое слова атрымалася? (Замацаванне.) Урок замацавання дае нам зразумець, што мы ўмеем і што павінны ведаць.

Тэма нашага ўрока – “Замацаванне”. Сёння на ўроку мы будзем займацца замацаваннем ведаў аб утварэнні, абазначэнні і дзесятковым складзе лікаў ад 10 да 15, а таксама замацуем уменне выконваць складанне і адніманне лікаў у межах 15 і ўменне вызначаць час па цыферблатным гадзінніку з дакладнасцю да гадзіны.

## II. ПАДРЫХТОЎКА НАВУЧЭНЦАЎ ДА ПРАЦЫ НА АСНОЎНЫМ ЭТАПЕ.

**Вуснае лічэнне**

1.У заданні трэба назваць лікі ў адпаведнасці са схемамі.



Як лік самы меншы? Самы большы?

Колькі дзясяткаў і адзінак змяшчае лік 12? 14? 15?

Які лік стаіць паміж лікамі 12 і 14? 15 і 13? 10 і 12?

Назавіце суседзяў ліку 12, 14.

На якім месцы ў натурльным радзе лікаў знаходзіцца лік 12, 14, 15?

Колькі трэба дабавіць да 12, каб атрымаць 14, 15?

Які лік атрымаецца, калі ад 15 адняць 1, 2, 3, 4, 5?

На колькі лік 15 большы за 10? Лік 12 за 10?

Які лік трэба павялічыць на 2 адзінкі, каб атрымаць лік 12?
Які лік трэба паменшыць на 3 адзінкі, каб атрымаць10, 12?

2. Гульня “Злаві шарык”.

*Вучням на картках трэба замаляваць толькі “свае” шарыкі. Напрыклад: 1 рад – з адказам 15; 2 рад – з адказам 14; 3 рад – з адказам 13.*




3. Складзі і рашы задачу.

**Было - 11** 

**Прыляцела – 4** 

**Стала - ?**

**III. ЭТАП ЗАМАЦАВАННЯ НОВЫХ ВЕДАЎ І СПОСАБАЎ ДЗЕЙНАСЦІ.**

**Настаўнік.** У заданні № 1 [1, с. 18] назавіце лікі. Які лік самы меншы? Самы большы?

У заданні № 2 [1, с. 18] настаўнік просіць не толькі назваць адказ, але і расказаць усё, што яны ведаюць пра лік 9. А ў заданні № 3 [1, с. 18] вучні называюць выпадкі, дзе можна выканаць параўнанне без вылічэнняў.

Вучні разам з настаўнікам знаёмяцца з умовамі задач № 4 [1, с. 18] і параўноўваюць іх.

*Дзеці выконваюць рухі, якія нагадваюць дзеянні, апісаныя ў фізкультхвілінцы.*

**Фізкультхвілінка**

Наш гадзіннік прытаміўся,
Прыпазніўся ды спыніўся.
Раптам стрэлка – скок ды скок –
Паскакала ў іншы бок!
Тата наш гадзіннік зняў,
Батарэйку памяняў.
І ўжо каторы дзень
Добра, спраўна ён ідзе!

Настаўнік прапануе пазнаёміцца з задачай № 5 [1, с. 19].

**Настаўнік.** Колькі гадзін бабуля чытала кніжку? Што абазначае выраз “столькі ж”? Значыць, колькі гадзін яна вязала шкарпэткі? Назавіце пытанне задачы. Ці можам мы адказаць на яго?

*Настаўнік дэманструе цыферблат гадзінніка.*

**Настаўнік**. Што абазначае вялікая стрэлка? Маленькая стрэлка? Якая стрэлка рухаецца хутчэй? Чаму? Успомніце і скажыце, якія бываюць гадзіннікі? Які час паказваюць гадзіннікі ў заданні № 6 [1, с. 19].

Працуючы ў парах, вучні высвятляюць , якіх літар і геаметрычных фігур з лічбамі не хапае ў заданні 7 [1, с. 19].

***Фізкультхвілінка для вачэй***

**Настаўнік.** Колькі гадзін спачатку ехаў аўтобус? Колькі потым? Запішыце рашэнне задачы ў сшытак [2, с. 10].

Пасля выкананання задання ажыццяўляецца праверка, ацэньваюцца работы па крытэрыі “правільнасць/няправільнасць”.

У заданні № 1 [2, с. 10] вучні запісваюць лікі 15 і 14. Затым арганізуецца ўзаемаацэнка ў парах па крытэрыі “акуратнасць/неахайнасць”.

Настаўнік прапануе вучням заданні № 2 і № 3 [2, с. 10] выканаць самастойна. Пасля выкананання задання ажыццяўляецца праверка, ацэньваюцца работы па крытэрыі “правільнасць/няправільнасць”.

А ў заданні № 4 [2, с. 10] вучні разам знаходзяць адказ на пытанне “Колькі трактароў на полі?”

*Вучням раздаюцца карткі, на якіх трэба запісаць значэнні часу і намаляваць стрэлкі, якія адпавядаюць прапанаванаму значэнню часу* (№ 3 [3, с. 34]).




## VI. ЭТАП ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ УРОКА.

**Настаўнік.** Малайцы! Вы паспяхова справіліся з усімі заданнямі запланаванымі на ўрок, а гэта значыць, матэрыял засвоены вамі на “выдатна”! Самы час падвесці вынікі ўрока: успомніце мэты, якія ставілі. Каб даведацца, наколькі кожны з вас быў паспяховым у іх дасягненні, прапаную аб’яднацца ў групы і разгадаць шыфр.

*Настаўнік дзеліць клас на групы па радах. Кожнай групе выдаецца картка. Вучні, працуя ў групе, устанаўліваюць суадносены паміж прыкладам і яго адказам. Атрымліваецца слова “супер”.*

| | |
|---|---|
| **11 + 4** | **10 П** |
| **13 – 2** | **12 Р** |
| **15 – 5** | **11 У** |
| **12 + 2** | **15 С** |
| **15 – 3** | **14 Е** |

**Рэфлексія “Святлафор”.**

*У кожнага вучня на парце карцінка светлафора. Тэба размаляваць адзін круг светлафора:*



працаваць было лёгка;

засталіся пытанні; было цяжка.

Дзякуй за ўрок!

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. **Матэматыка:** вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. 2 частка. //Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан. – Мінск: НІА, 2019.
2. **Матэматыка:** рабочы сшытак: вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. 2 частка. //Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан., С.В.Гадзаава., С.А.Капылова. – Мінск: НІА, 2019.
3. **Матэматыка.** 1 клас: самастойныя і кантрольныя работы: варыянт-1; /Г.Л.Мураўёва., М.А.Урбан., С.В.Гадзаава., С.А.Капылова. – Мінск: Аверсэв, 2020. – 78 с. : іл.